Юбілей

ШКОЛЕ ЁСЦЬ КІМ ГАНАРЫЦЦА

У лістападзе Веткаўская сярэдняя школа № 1 імя Андрэя Грамыкі адзначыла сваё 150-годдзе

Паўтара стагоддзя таму ўстанова была заснавана як Веткаўскае жаночае народнае вучылішча, якое ўтрымлівалася на дзяржаўныя сродкі. 50 гадоў таму да круглай даты школа атрымала падарунак у выглядзе новага трохпавярховага цаглянага будынка.

Былыя рэктары Гомельскага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны Міхаіл СЕЛЬКІН і Аляксандр РАГАЧОЎ на юбілеі школы.

Мясцовы музей баявой і працоўнай славы, створаны некалі педагогам і байцом партызанскага атрада Яўгеніяй Дынькінай, захоўвае ў тым ліку экспанаты, якія расказваюць гісторыю школы з канца XIX стагоддзя.

Настаўнік Сяргей Перапялюк да юбілею выпусціў выданне, у якім сабраў самыя цікавыя старонкі біяграфіі школы. У ім, напрыклад, паслужны фармулярны спіс адной з першых настаўніц, дачкі святара — Марыі Рыгораўны Галавінскай, якая прыйшла сюды выкладаць 1 верасня 1886 года. У чэрвені 1896 года імператарскім указам ёй быў падараваны сярэбраны медаль з надпісам «За стараннасць». У музеі захоўваецца і колішняя пячатка вучылішча. Яе знайшла ў сваім агародзе і падарыла музею жыхарка Веткі Алена Гаспадарова.

Самае галоўнае, што складае гонар вучэбнай установы — яе выпускнікі. Дарэчы, іх імёны вядомыя на ўсёй постсавецкай прасторы. Двойчы Герой Савецкага Саюза Павел Галавачоў, які здзейсніў самы вышынны таран падчас Вялікай Айчыннай вайны. Герой Савецкага Саюза Міхаіл Батракоў, старшыня Савета Міністраў БССР Уладзімір Бровікаў і намеснік старшыні Саўміна таго ж часу Ніна Сняжкова, начальнік Маскоўскага вышэйшага ваеннага каманднага вучылішча генерал-маёр Іван Магонаў...

Сённяшні намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар Петрышэнка таксама заканчваў Веткаўскую школу № 1 — у 1982 годзе. Пра альма-матар не забываецца і цяпер. Сёлета на вераснёўскай лінейцы віцэ-прэм'ер ад імя ўрада ўручыў кіраўніцтву ўстановы сертыфікат на абсталяванне камп'ютарнага класа.

Ёсць і іншыя вядомыя дзяржаўныя і грамадскія дзеячы нашага часу — выпускнікі Веткаўскай школы № 1: рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Валерый Галубоўскі, два былыя рэктары Гомельскага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны — Міхаіл Селькін і Аляксандр Рагачоў, расійскія і беларускія навукоўцы Сяргей і Аляксандр Караткевічы.

Дырэктар школы № 1 Алена Новікава — таксама яе выпускніца. Яна кажа, што тыя, хто тут вучыўся, імкнуцца не забываць адзін аднаго. Многія становяцца добрымі сябрамі. Падтрымлівае кантакты са школай і Аляксей Грамыка — унук легендарнага савецкага дыпламата Андрэя Грамыкі, які нарадзіўся на Веткаўшчыне і чыё імя цяпер носіць школа.

Цяпер у ёй навучаюцца каля 660 школьнікаў. Многія паказваюць выдатныя вынікі на алімпіядах, маюць перамогі ў конкурсах і спаборніцтвах рознага ўзроўню. Значыць, расце годная змена славутым папярэднікам.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Стары будынак Веткаўскай школы № 1.

КАЛЯДНЫЯ ПАДАРУНКІ

Смачна, з музыкай і спевамі і на карысць дзецям — у Мінску прайшоў Міжнародны калядны кірмаш, які штогод традыцыйна арганізоўвае клуб жонак паслоў, дыпламатаў і замежных прадстаўнікоў. Больш за 28 пасольстваў замежных краін прынялі ўдзел у дабрачынай акцыі.

Нямецкія каўбаскі і англійскі чай, украінскае сала і чэшскія напоі — гэтым і не толькі можна было пачаставацца, а таксама набыць сувенірную прадукцыю, прадстаўленую рознымі краінамі свету. І ўсё гэта пад суправаджэнне дынамічных танцаў і цудоўных спеваў — пляцоўка гатэля «Рэнесанс», дзе ладзілася мерапрыемства, на нейкі час ператварылася ў мультыкультурнае асяроддзе. З усіх бакоў — размовы на розных мовах, разнастайныя нацыянальныя ўборы, розныя колеры скуры і валасоў, але адно аб'ядноўвала тых, хто тут сабраўся, — гэта ўсмешкі на тварах. Бо ўсе гэтыя людзі рабілі добрую справу, дапамагалі дзецям. Набываючы страву ці сувенір, кожны рабіў свой унёсак у дабрачынную скарбонку. Сродкі, якія будуць сабраны падчас акцыі, пойдуць на дабрачынныя мерапрыемствы.

Андрэй САЗОНАЎ, фота аўтара.

Білеты ў спартыўнае лета

У першы дзень зімы стартаваў продаж білетаў на II Еўрапейскія гульні

1 снежня быў адкрыты продаж у інтэрнэце, 15 снежня іх можна будзе набыць і ў касах горада. Як і абяцалі арганізатары раней, цэны на білеты вар'іруюцца ад 5 да 50 рублёў. Распрацаваны некалькі катэгорый білетаў: «Standard», VIP, на цырымонію адкрыцця і цырымонію закрыцця.

Дарэчы, кошт квіткоў на цырымонію адкрыцця вар'іруецца ад 150 да 300 рублёў у залежнасці ад катэгорыі месца. Цэны білетаў на цырымонію закрыцця некалькі ніжэйшыя — ад 70 да 150 рублёў.

«Старт продажаў нават у пэўным сэнсе перасягнуў нашы чаканні. У першы дзень было прададзена каля 12 % білетаў ад той партыі, якую мы выпусцілі ў продаж. Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца цырымоніі адкрыцця і закрыцця», — паведаміў **дырэктар Дырэкцыі II Еўрапейскіх гульняў Анатоль КОТАЎ.**

Таксама ён дадаў, што ўжо напісаны папярэдні сцэнарый цырымоній адкрыцця і закрыцця, падабраныя генеральны падрадчык і тэхнічны падрадчык, вядзецца работа па падборы хэдлайнера. Гэта будзе зорка сусветнага ўзроўню. *«Мы раскрыем сакрэт 21 чэрвеня 2019 года. Гэта павінна быць прыемнай нечаканасцю. У Баку гэта была Лэдзі Гага. Пра тое, што яна выступіць на адкрыцці, ведала чалавек 10. У нас сітуацыя ідэнтычная. Будзем трымаць інтрыгу да апошняга»*, — сказаў Анатоль Котаў.

Галоўнай цікавінкай цырымоніі будзе запальванне гістарычнага алімпійскага факела. Ён атрымае новае жыццё і новы сімвалізм. Яшчэ адна адметнасць — выкарыстанне тэхналогіі дапоўненай рэальнасці, калі з дапамогай гаджэтаў можна будзе бачыць тое, што без іх — немагчыма.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Надвор'е

Увесь тыдзень — каля нуля

Толькі ў пятніцу падмарозіць, месцамі — да мінус 12 градусаў

На гэтым тыдні ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будуць у асноўным вызначаць атмасферныя франты, якія змяшчаюцца з Заходняй Еўропы, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Таму чакаецца няўстойлівае надвор'е з ападкамі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Тэмпературны фон наблізіцца да кліматычнай нормы, толькі ў канцы працоўнага тыдня тэрыторыя краіны ненадоўга апынецца ў вобласці павышанага атмасфернага ціску, ападкаў стане менш, а ўначы падмарозіць.

Сёння ўдзень часам чакаюцца дажджы, па ўсходніх раёнах краіны — з мокрым снегам. Слабы туман, месцамі па ўсходзе галалёд, на дарогах галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра будзе ад нуля да плюс 6 градусаў. У сераду ўначы на большай частцы тэрыторыі краіны, а ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы з мокрым снегам. У асобных раёнах чакаецца галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы месцамі згусціцца туман. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла.

На наступны дзень пахаладае. У чацвер месцамі па краіне пройдзе кароткачасовы снег, на асобных участках дарог будзе галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы панізіцца ад мінус 1 да мінус 7 градусаў. Удзень будзе ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу ўначы месцамі чакаецца кароткачасовы снег. Удзень франтальны раздзел абумовіць на большай частцы тэрыторыі краіны снег, мокры снег, па паўднёвым захадзе — з дажджом. У асобных раёнах чакаецца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—9 марозу, па ўсходзе Беларусі пры праясненнях паветра астудзіцца да мінус 10—12 градусаў. Удзень тэмпература паветра складзе ад мінус 4 градусаў па паўночным усходзе да 4 градусаў цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

Сяргей КУРКАЧ.

Неспрыяльныя дні і гадзіны ў снежні

5, серада, 22.00 – 24.00	20, чацвер, 2.30 – 16.30
6, чацвер, 0.00 – 5.00	22, субота, 16.30 – 19.00
8, субота, 12.00 – 15.00	24, панядзелак, 17.00 – 19.30
10, панядзелак, 22.30 – 24.00	26, серада, 17.30 – 20.00
13, чацвер, 12.30 – 14.30	28, пятніца, 18.30 – 22.30
15, субота, 14.00 – 24.00	30, нядзеля, 23.00 – 24.00
16, нядзеля, 0.00 – 3.00	31, панядзелак, 0.00 – 3.30
18, аўторак, 9.30 – 11.30	